АБ ПАВЕЛІЧЭННІ ВЫТВОРЧАСЦІ, РАСШЫРЭННІ АСАРТЫМЕНТУ І ПАЛЯПШЭННІ ЯКАСЦІ ТАВАРАЎ НАРОДНАГА ЎЖЫТКУ, ЯКІЯ ВЫПУСКАЮЦЦА ПРАДПРЫЕМСТВАМІ РЭСПУБЛІКІ

Даклад Старшыні Савета Міністраў БССР дэпутата Ц. Я. КІСЯЛЁВА

Таварышы дэпутаты!

Чарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР сабралася ў пераддзень знамянальнай даты — дваццацігоддзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Вы ведаеце, якія незлічоныя бедствы прынесла нам вайна. Яна адабрала ў беларускага народа жыццё соцень тысяч яго лепшых сыноў і дачок. Акупанты разграбілі і знішчылі звыш палавіны нацыянальнага багацця рэспублікі — па сутнасці ўсё, што было створана за гады Савецкай улады. Па прамысловай вытворчасці рэспубліка была адкінута да ўзроўню 1913 года. Усё трэба было будаваць нанава: заводы, фабрыкі, жыллё, школы, бальніцы, культурна-асветныя ўстановы.

Пад кіраўніцтвам і пры пастаяннай дапамозе ЦК КПСС і саюзнага ўрада беларускі народ, з брацкай дапамогай усіх народаў нашай Радзімы і перш за ўсё вялікага рускага народа, не толькі пераадолеў цяжкасці пасляваеннага аднаўленчага перыяду, але і пайшоў далёка наперад. У многа разоў перавышан даваенны ўзровень ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Дастаткова сказаць, што ў 1963 годзе валавая прадукцыя ўсёй прамысловасці ў параўнанні з 1940 годам узрасла ў 5,8 раза. У рэспубліцы адноўлена і пабудавана больш чым 650 буйных прамысловых прадпрыемстваў.

Значныя змены здбыліся ў сельскай гаспадарцы. У 1963 годзе ў параўнанні з даваенным 1940 годам трактарны парк павялічыўся ў 6,2 раза, парк збожжаўборачных камбайнаў—у 7,7 раза, грузавых аўтамабіляў — у 6,7 раза. Значна ўзраслі вытворчасць і нарыхтоўкі ўсіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі.

Дзяржаўны жылы фонд цяпер намнога перавышае даваенны. У сельскай мясцовасці за 20 пасляваенных гадоў пабудавана 725.900 дамоў. У ВНУ ў 1963 годзе займалася студэнтаў у 4 разы больш, чым да вайны, а ў тэхнікумах і іншых сярэдніх спецыяльных навучальных установах — у 2,7 раза больш.

У мінулым годзе ў народнай гаспадарцы рэспублікі працавала 333.100 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, або ў 3,8 раза больш, чым на 1 студзеня 1941 года.

У рэспубліцы створаны новыя галіны прамысловасці, выраслі новыя гарады і вёскі.

Разам з развіццём машынабудавання, станкабудавання і іншых галін прамысловасці, вырасла і расшырана віцебская панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ», Бабруйская трыкатажная фабрыка, Гродзенскі тонкасуконны камбінат. У гор. Пінску пабудаван завод па вырабу штучнай скуры, у Гродна — новая абутковая фабрыка, у Бабруйску — фабрыка па пашыўцы футравых зырабаў. Уведзены ў строй дзеючых Мінскі гадзіннікавы завод, Віцебскі завод гадзіннікавых дэталей, Мінскі завод бытавых халадзільнікаў, магутнасці па выпуску радыёпрыёмнікаў, тэлевізараў і многіх іншых тавараў культурна-бытавога прызначэння.

Значнае развіццё набыла харчовая прамысловасць. Пабудаваны і працуюць Жабінкаўскі і Гарадзейскі цукровыя заводы, Гарынскі і Слуцкі кансервавыя заводы, 12 механізаваных хлебазаводаў, Калінкавіцкі, Брэсцкі, Кобрынскі, Ашмянскі, Глыбоцкі мясапутшка-камбінаты, 4 малочныя заводы, 11 масласырзаводаў і рад іншых прадпрыемстваў.

Праведзена рэканструкцыя многіх дзеючых прадпрыемстваў. Сістэматычна вядзецца работа па ўдасканальванню вытворчасці, укараненню новай тэхнікі і перадавой тэхналогіі. За апошнія пяць гадоў у лёгкай, тэкстыльнай і харчовай прамысловасці ўкаранёны 363 механізаваныя паточныя лініі. Замест устарэлага, малапрадукцыйнага абсталявання ўстаноўлена больш чым 4 тысячы новых машын і аўтаматаў. Агульны эканамічны эфект ад укаранення новай тэхнікі толькі на харчовых прадпрыемствах склаў больш чым 7,5 мільёна рублёў.

У рэспубліцы праводзяцца спецыялізацыя прадпрыемстваў, якія выпускаюць тавары народнага ўжытку, канцэнтрацыя вытворчасці. На базе аднародных прадпрыемстваў створаны вытворчыя аб'яднанні-фірмы: абутковыя — у Мінску і Гомелі, гадзіннікавая — у Мінску, тытунёвая — у Гродна, па індывідуальнай пашыўцы адзення — у сістэме Галоўбытмясцпрома. Гэта новая форма арганізацыі вытворчасці дае магчымасць лепш выкарыстоўваць рэзервы прадпрыемстваў, зрабіць больш танным кіраўніцкі апарат, няспынна зніжаць сабекошт і паляпшаць якасць прадукцыі. Яна заслугоўвае ўсямернага пашырэння.

За прайшоўшыя гады сямігодкі аб'ём вытворчасці валавой прадукцыі лёгкай прамысловасці 1958 годам на 148 працэнтаў, з 1953 годам у 2,8 раза і з даваенным 1940 годам — у 3,8 раза. У 1963 годзе ў БССР на душу насельніцтва прададзена тавараў у 4,1 раза больш, чым у 1940 годзе.

Продаж насельніцтву харчовых тавараў у 1963 годзе ў параўнанні з 1958 годам склаў 161 працэнт, у тым ліку мясных прадуктаў — 162 працэнты, рыбных — 154, малака і малочных прадуктаў — 184, яек — 294, цукру — 193, кандытарскіх вырабаў — 168 працэнтаў. Продаж швейных вырабаў у 1963 годзе ў параўнанні з 1958 годам склаў 151 працэнт, трыкатажных — 163, панчох і шкарпэтак — 156, абутку — 140 і мэблі — 180 працэнтаў.

* * *

Таварышы, поспехі, дасягнутыя прамысловасцю, — вынік творчай, самаадданай працы ўсяго беларускага народа, які разам з усімі брацкімі народамі нашай Радзімы пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза стварае матэрыяльна-тэхнічную базу камунізма.

Рабочыя, інжынеры, тэхнікі, спаборнічаючы за звачне калектывы камуністычнай працы, настойліва дабіваюцца павышэння прадукцыйнасці працы, паляпшэння якасці прадукцыі і зніжэння яе сабекошту.

У тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці Саўнаргаса рэспублікі ў спаборніцтве за камуністычную працу ўдзельнічае 87 працэнтаў, у мэблевай і дрэваапрацоўчай прамысловасці — больш чым палавіна ўсіх працуючых. На прадпрыемствах мясцовых Саветаў у гэта спаборніцтва ўключыліся больш чым 2 тысячы брыгад, змен і ўчасткаў. Многія калектывы, а таксама тысячы рабочых ужо ўдастоены ганаровага звання брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы.

Віцебскаму дывановаму камбінату (дырэктар тав. Пятроў) аднаму з першых у рэспубліцы прысвоена званне прадпрыемства камуністычнай працы. Яго калектыў працягвае настойліва змагацца за паляпшэнне ўсіх тэхніка-эканамічных паказчыкаў.

Права называцца прадпрыемствам высокай культуры вытворчасці заваявала Бабруйская швейная фабрыка імя Дзяржынскага (дырэктар тав. Сакалоў). Калектыў яе не толькі сістэматычна выконвае планы па выпуску валавой прадукцыі, павышэнню прадукцыйнасці працы і зніжэнню сабекошту, але і забяспечвае высокую якасць вырабаў.

Спаборніцтва за камуністычную працу нараджае сотні наватараў вытворчасці. Ткачыха Мінскага тонкасуконнага камбіната, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР Алена Сцяпанаўна Лазарэнка — ініцыятар спаборніцтва за выдатную якасць прадукцыі і асваенне новых відаў тканін за скарочаныя тэрміны, без зніжэння прадукцыйнасці працы і абсталявання. У выніку ўкаранення метаду тав. Лазарэнкі камбінат дабіўся ў 1963—1964 гг. зніжэння страт пры асваенні новых відаў тканін на 64,3 працэнта, а тэрміны асваення скарочаны са 122 дзён у 1962 годзе да 59 дзён у 1963 годзе.

На прадпрыемствах лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці пачын А. С. Лазарэнкі падтрымалі 30 тысяч, а ўсяго ў прамысловасці рэспублікі — больш чым 57 тысяч чалавек. У 1963 годзе саўнаргас стварыў у тэкстыльнай, лёгкай, электратэхнічнай і прыборабудаўнічай галінах прамысловасці рэспубліканскія школы пашырэння перадавога вопыту работы гэтай выдатнай працаўніцы.

Памочнік майстра Віцебскага дывановага камбіната Пётр Дзмітрыевіч Клімкоў выступіў з ініцыятывай аб павышэнні ролі майстра ў арганізацыі ўсіх членаў калектыву на барацьбу за ажыццяўленне планаў камуністычнага будаўніцтва. Гэты пачын таксама знайшоў шырокі водгук і падтрымку на прадпрыемствах рэспублікі. Кіраўнікі брыгад камуністычнай працы Валянціна Фёдараўна Жардзецкая з Мінскага маргарынавага завода, Марыя Уладзіміраўна Цішчанка з Мінскай швейнай фабрыкі імя Крупскай, Віктар Пятровіч Ганчароў з Аршанскага завода швейных машын, Галіна Андрэеўна Навумава з Мінскага радыёзавода; ударнікі камуністычнай працы Вільгельміна Аляксандраўна Філіповіч — закройшчыца абутковага вытворчага аб'яднання «Прамень», Галіна Канстанцінаўна Івашкевіч — машыніст гільзанабіўнога агрэгата Мінскай тытунёвай фабрыкі, Віктар Фядосавіч Копцік — майстар Аршанскага льнокамбіната і многія, многія іншыя.

Адным з праяўленняў камуністычных адносін да працы з'яўляецца рух самой грамадскасці за гонар фабрычнай маркі. На Бабруйскай швейнай фабрыцы імя Дзяржынскага з ліку лепшых рабочых вылучана больш чым 200 грамадскіх кантралёраў. Гэта дало магчымасць скасаваць апарат аддзела тэхнічнага кантролю ва ўсіх пашывачных цэхах. Прадукцыя фабрыкі мае добры попыт у насельніцтва.

Вопыт стварэння інстытута грамадскіх кантралёраў заслугоўвае стараннага вывучэння і пашырэння на іншых прадпрыемствах рэспублікі.

Наогул хочацца падкрэсліць велізарную ролю народнага кантролю ў барацьбе за павышэнне якасці тавараў народнага ўжытку. Асабліва гэта стала прыкметна пасля стварэння органаў партдзяржкантролю. Групы і пасты садзейнічання, камітэты партдзяржкантролю чула адносяцца да сігналаў працоўных, старанна правяраюць іх прэтэнзіі, настойліва дабіваюцца ліквідацыі недахопаў.

Знаходзіць і выкарыстоўваць наяўныя рэзервы — у гэтым галі больш рацыянальнага раскрою дасць магчымасць штогод эканоміць мяккіх скуртавараў (без шкоды для якасці) звыш 3 мільёнаў квадратных дэцыметраў, што роўна гадавой патрэбнасці Баранавіцкай, Бабруйскай і Маладзечанскай абутковых фабрык, разам узятых.

Значныя рэзервы ёсць у тэкстыльнай і іншых галінах прамысловасці. Укараненне рацыянальных норм расходу пражы дасць магчымасць тэкстыльным прадпрыемствам саўнаргаса эканоміць да 80 тон шарсцяной пражы за год. За кошт гэтага можа быць дадаткова выраблена звыш 140 тысяч метраў тканіны і да 20 тысяч вырабаў верхняга трыкатажу на суму каля 900 тысяч рублёў.

Гэтыя прыклады пераканаўча сведчаць аб наяўнасці вялікіх рэзерваў у прамысловасці, якая выпускае тавары народнага ўжытку.

Пытанні павышэння прадукцыйнасці працы і зніжэння сабекошту прадукцыі на аснове паляпшэння арганізацыі вытворчасці, больш поўнага выкарыстання вытворчых магутнасцей, эканоміі сыравіны, матэрыялаў настойліва патрабуюць паляпшэння эканамічнай работы на прадпрыемствах, якія выпускаюць тавары народнага ўжытку.

На перадавых прадпрыемствах краіны і нашай рэспублікі набыт значны вопыт работы грамадскіх бюро эканамічнага аналізу, нарміравання і арганізацыі працы, канструктарскіх і тэхналагічных бюро і іншых форм прыцягнення грамадскасці да вырашэння эканамічных праблем. Саўнаргас, Галоўбытмясцпром, савецкія органы, гаспадарчыя арганізацыі павінны ўкараніць гэты вопыт на ўсіх прадпрыемствах.

УСЯМЕРНА ПАЛЯПШАЦЬ ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ

У справаздачным дакладзе XXII з'езду КПСС таварыш М. С. Хрушчоў гаварыў: «Настаў час больш востра паставіць задачу рэзкага паляпшэння якасці ўсіх тавараў... Неабходна палепшыць работу прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, дабіцца, каб усе тавары народнага ўжытку былі не толькі добрыя, але і прыгожыя, выдатныя тавары».

ЦК КПБ і Савет Міністраў Беларусі ў мінулым годзе прынялі спецыяльную пастанову аб паляпшэнні якасці тавараў народнага ўжытку.

У рэспубліцы праведзена пэўная работа па паляпшэнню якасці вання і маркіравання [illegible] абутку, [illegible] малюнкаў і [illegible] каму афармленню прадметаў [illegible] турнага ўжытку, [illegible] жырна-тэхнічных [illegible] прадпрыемстваў [illegible] спаборніцтва [illegible] рычнай маркі. [illegible] ажыццёўлен рад арганізацыйна-тэхнічных [illegible] ваных на паляпшэнне якасці [illegible] кавага выпуску прадукцыі, [illegible] дышых узораў тавараў. Праўда, часам у магазінах цяжка знайсці тавары, якія паказваюцца на выстаўках, таму што кіраўнікі некаторых прадпрыемстваў навучыліся рабіць добрыя [illegible] толькі для паказу, а ў [illegible] пені скараціць колькасць мадэлей, пакінуўшы толькі тыя, якія атрымалі прызнанне ў пакупнікоў, і працягваць працаваць над далейшым паляпшэннем іх канструкцый.

Сур'ёзныя і справядлівыя нараканні спажыўцоў на якасць адзення. Нярэдка з добрых матэрыялаў выпускаюцца вырабы, якія не знаходзяць збыту, залежваюцца на гандлёвых складах, уцэньваюцца, у выніку чаго дзяржава нясе вялікія страты, а запатрабаванні пакупнікоў не задавальняюцца.

Аб [illegible] якасць адзення ў нас усё [illegible] нізкая, сведчыць той факт, што [illegible] частка швейных [illegible] якасці [illegible] 33 годзе і 1 квартале 1964 [illegible] ўцэнена [illegible] чым палавіна [illegible] Аршанскі [illegible] Рэчыцкі швейны [illegible] Мінскім, Дзяржынскім і Мар[illegible] камбінатах [illegible] Няўжо [illegible] тт. Зайцаў, [illegible] Рагінская, Кулікоўскі і [illegible] не разумеюць, што выпуск [illegible] гэта [illegible] гэта [illegible]? Нездарма ж гаворыць, што брак[illegible] радня раскрадальніку.

Асноўная прычына нізкай якасці адзення — недахопы ў канструяванні, парушэнні тэхналогіі пашыўкі. Нярэдка да добрага верхняга

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БУДОЎЛЯМ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ЛЁГКАЙ І ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ—ШТОДЗЁННУЮ ЎВАГУ